З новым 1971 годам!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 38 (795) ● Серада, 30 снежня 1970 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ, СЯБРЫ!

Завяршаецца год 1970-ы. З пачуццём вялікага задавальнення савецкі народ правядзіць яго. Гэта быў год вялікіх здзяйсненняў, напружанай творчай працы. Наша вялікая Радзіма пад кіраўніцтвам слаўнай Камуністычнай партыі Савецкага Саюза зрабіла новы плённы крок па шляху будаўніцтва камуністычнага грамадства. Паспяхова выкананы заданні пяцігодкі, наша прамысловасць і сельская гаспадарка далі народу многа звышпланавай прадукцыі. Зыркім святлом у вокнах нашага вялікага сацыялістычнага дома свеціцца культура. У шырокіх маштабах ажыццяўляецца будаўніцтва жылля, культурна-бытавых устаноў. Новыя поспехі дасягнуты у галіне навукі і тэхнікі, народнай асветы і аховы здароўя, літаратуры і мастацтва. Няўхільна павышаецца дабрабыт народа.

Новы год будзе яшчэ больш адметны. Гэта год XXIV з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, год нашага новага узлёту да вяршынь камуністычнага грамадства.

Прыемна усведамляць, што і для нашага калектыву 1971 год будзе надзвычай адметны у першую чаргу падзеямі, звязанымі з XXIV з'ездам. Акрамя таго, Беларускі дзяржаўны універсітэт імя Уладзіміра Ільіча Леніна ва урачыстай абстаноўцы, разам з усім беларускім народам адзначыць сваё слаўнае 50-годдзе.

Прайдзіцеся сёння па карпусах універсітэта, паглядзіце, як ён вырас, набраўся сілы, пасвятлеў! Вы адчуеце, што усюды б'ецца рытм суладнага жыцця. Гэта — неад'емная часцінка нашай Радзімы, слаўнай Беларусі.

Рэктарат, партыйны камітэт, мясцком, камітэт камсамола і прафком звяртаюцца да калектыву універсітэта з сяброўскімі навагоднімі пажаданнямі — пажаданнямі шчаслівай плённай працы, шчаслівага асабістага жыцця, шчаслівага служэння на карысць Бацькаўшчыны. Няхай новы, 1971 год прынясе у наш агульны вялікі дом новыя радасці.

Нашы інтэрв'ю

АПОШНІЯ Ў 1970-м

З якімі ўражаннямі вы пакідаеце год мінулы і што чакаеце ад года наступаючага?—з такімі пытаннямі мы звярнуліся да нашых чытачоў. Вось што яны адказалі:

Доктар філалагічных навук паэт А. А. ЛОЙКА:

— Не ведаю нават, з чаго пачаць: уражанняў у мінулым годзе было надзвычай многа. Перш за усё—гэта паездкі па Беларусі. Па Гродзеншчыне — у сувязі са святкаваннем 130-годдзя з дня нараджэння Францішка Багушэвіча, калі прыйшлося выступіць у Жупранах, Смаргоні, Ашмянах; па Брэстчыне — у снежні месяцы у сувязі з тыднем беларускай літаратуры у гэтай вобласці, калі давялося пабываць на радзіме Паўлюка Багрыма у Крошына каля Баранавіч, у вёсцы Люсіна, дзе настаўнічаў Якуб Колас, выступаць перад калгаснікамі у Целяханах, Івацэвічах, Ляхавічах.

Незабыўнай і сапраўды паэтычнай была для мяне паездка з групай студэнтаў-філолагаў у Германскую Дэмакратычную Рэспубліку, у Іенскі універсітэт. Мне выпала шчасце наведаць ленінскія мясціны, пабываць у Веймары, Эйзенаху, Лейпцыгу, Берліне, Патсдаме.

Вершы аб уражаннях з паездак яшчэ не выпісаліся. Але, перш за усё, складваюцца цыклы «Палессе — любоў мая» і «Цюрынгскія бярозы».

У новым годзе чакаю выхаду дзвюх паэтычных кніжак: «Калі у дарозе ты» (выбранае) і «Моя планета» (на рускай мове у выдавецтве «Советский писатель»). Прыемна, што удалося падрыхтаваць «Універсітэт паэтычны» — зборнік, у якім будзе прадстаўлена каля 100 аутарау, якія у свой час вучыліся і вучацца у БДУ.

Старшыня праулення студэнцкага клуба В. ЛІТВІНКА:

Мінулы год быў па-сапраўднаму творчым у рабоце праулення студэнцкага клуба.

У студзені — пачатку лютага народны аркестр народных інструментаў ірыняў удзел ва універсіядзе, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна, у горадзе Ленінградзе.

Увесь год быў пранізан падрыхтоукай да юбілейнага фестывалю. Яго удзельнікамі былі усе калектывы універсітэта. Народны аркестр народных інструментаў зноў прызнан лепшым у рэспубліцы. У ліку прызёраў аказалася і народная харавая капэла. Упершыню сярод народных ансамбляў танца спаборнічаў наш «Крыжачок» і заняў другое месца. У верасні гэтага ж года ансамбль прымаў удзел у фестывалі, прысвечаным юбілею камсамола Беларусі, і стаў лаўрэатам.

Значнай падзеяй для народнай харавой капэлы быў удзел у II міжрэспубліканскім конкурсе студэнцкіх змешаных акадэмічных хораў «Ювэнтус-70», які праходзіў у Літаўскай ССР у Каунасе. Тут капэла атрымала два прызы.

Планы на наступны год: правесці Усесаюзную універсіяду, прысвечаную 50-годдзю нашага універсітэта; агляд мастацкай самадзейнасці, прысвечаны гэтаму ж юбілею; плануюцца выезды калектываў у сацыялістычныя краіны, канцэртныя выступленні у рэспубліцы, творчыя сустрэчы.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

У ЛЕНІНСКІМ ЮБІЛЕЙНЫМ

⊙ Падрыхтавана для народнай гаспадаркі, культуры, навукі, народнай асветы 2144 кваліфікаваных спецыялістаў.

⊙ Абаронена у 1970 годзе 23 доктарскія дысертацыі, 15 з іх—вучонымі нашага універсітэта; кандыдацкіх—91, у тым ліку 47—выкладчыкамі БДУ.

⊙ У рады КПСС прынята 27 чалавек. Сярод іх—3 загадчыкі кафедр, 9 выкладчыкаў, 5 супрацоўнікаў, 12 студэнтаў.

⊙ Лектарамі універсітэта (выкладчыкамі і студэнтамі) прачытана 3000 лекцый, праведзена 36 навукова-тэарэтычных канферэнцый, 65 дыспутаў).

⊙ У выдавецтве БДУ выйшлі у свет кнігі, часопісы, брашуры 87 назваў тыражом 450 тысяч экземпляраў.

АПОШНІЯ Ў 1970-м

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

З пытаннем «Што асаблівага у апошнія дні адыходзячага года у рабоце універсітэцкай бібліятэкі?» мы звярнуліся да яе дырэктара *Іраіды Уладзімірауны АРЭХОЎСКАЙ.*

— Перш за усё, з пачуццём вялікай адказнасці мы сустракаем экзаменацыйную сесію. Ведаем, што ад работнікаў бібліятэкі у многім залежыць яе поспех. У сувязі з гэтым мы змянілі графік работы, прадоўжылі працоўны дзень. Цяпер і на працягу усёй сесіі бібліятэка будзе адкрыта з 9 да 22 гадзін.

Нядаўна мы адзначылі вялікую падзею: наш кніжны фонд дасягнуў мільёна тамоў.

Рыхтуючыся да XXIV з'езда КПСС і 50-годдзя універсітэта, абнауляем наглядную агітацыю, вывучаем фонд навуковай чытальнай залы з тым, каб папоўніць яго неабходнай літаратурай і гэтым садзейнічаць паспяховаму развіццю навуковых даследаванняў.

Да юбілею універсітэта наважаны завяршыць указальнік навуковых прац супрацоўнікаў БДУ, якія былі апублікаваны у друку у апошнія 11 год. Гэта вялікая і цікавая праца. Да гэтай жа даты рыхтуем альбом па гісторыі бібліятэкі, у стварэнні якога вялікі ўдзел прымаюць ветэран універсітэцкай бібліятэкі Р. Г. Любіна і студэнты гістарычнага факультэта.

У заключэнне мне хочацца пажадаць студэнтам і супрацоўнікам універсітэта шчаслівага Новага года, поспехаў у вучобе і працы, а газеце «Беларускі універсітэт» — вечнай маладосці.

Некалькі месяцаў назад мы паведамлялі, што адна з кафедр БДУ—кафедра гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў — стала удзельніцай ВДНГ у Маскве.

А сёння радасная перадnавагодняя навіна: яшчэ адна кафедра—гісторыі КПСС прыродазнаучых факультэтаў—удастоена гэтага гонару.

Калектыў, які ўзначальвае дацэнт Т. І. Прытыцкая, накапіў каштоўны вопыт работы са студэнтамі, шырока і разнастайна прымяняе тэхнічныя сродкі навучання, вядзе вялікую навуковую і прапагандысцкую работу. Заслужанай папулярнасцю карыстаецца кабінет гісторыі КПСС гэтай кафедры.

НА ЗДЫМКУ: каля адной з экспазіцый кабінета гісторыі КПСС.
Фота Д. ПРЭСА.

ПА УНІВЕРСІТЭТУ

□ На мінулым тыдні наш універсітэт наведалі ніраўніні Саюза Свабоднай Нямецкай моладзі Іенскага універсітэта імя Ф. Шылера. Яны разам з прадстаўнікамі камітэта камсамола БДУ В. Праношыным, В. Гурыным, В. Кушнерам, П. Кухарчыкам абмеркавалі праект дагавора аб дружбе і супрацоўніцтве камітэтаў абодвух універсітэтаў на 1971 год.

Дагавор прадугледжвае абмен вопытам работы маладзёжных арганізацый, зборнікамі студэнцкіх навуковых прац, студэнцкімі дэлегацыямі, будаўнічымі атрадамі, а таксама калектывамі мастацкай самадзейнасці і спартыўнымі камандамі.

□ У мінулым навучальным годзе 15-я група другога патока аддзялення агульнай фізікі заняла другое месца ў спаборніцтве на лепшую акадэмічную групу. За поспехі у вучобе і грамадскай рабоце студэнты атрымалі права на паездку ў горад Ленінград. Нядаўна яны вярнуліся з цікавага падарожжа.

На гістфаку з лекцыяй «Сацыялістычны шлях развіцця Польшчы» выступіў старшы навуковы супрацоўнік Інстытута польска-савецкіх адносін доктар Э. Басінскі.

□ Куміры. Сустрэчы з імі праходзяць заўсёды пры перапоўненых залах і аўдыторыях. Так было і на гэты раз, калі да студэнтаў геафака прыйшоў у госці славуты багатыр, чалавек, імя якога вядома ва ўсім свеце, — Аляксандр Мядзведзь.

Шчырым быў яго расказ аб першых кроках у спорце, аб перамогах, аб краіках, дзе даводзілася выступаць, аб звычках і традыцыях мясцовага насельніцтва, аб цікавых сустрэчах і здарэннях. Чэмпіён свету падзяліўся планамі на будучае і адказаў на пытанні.

Я папрасіў Аляксандра Васільевіча сказаць некалькі слоў чытачам «Беларускага універсітэта».

— Цяпер у студэнтаў цяжкая пара. Мае пажаданні—добра здаць сесію.

В. ЯЦЭВІЧ.

Незадоўга да Новага года паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю супрацоўнік кафедры электрафізікі А. Ф. Шылау.

Першы залік у зімовую сесію. Колькі трывог і хваляванняў! І вось усё засталося ззаду: выкладчык курса беларускай сучаснай мовы А. І. Наркевіч задаволен адказам студэнткі І курса факультэта журналістыкі Н. Сакаловай.

Фота М. ШУЛЬМАНА.

ДА СЕСІІ — У ПОЎНЫМ УЗБРАЕННІ

Поспехі сесіі заўсёды залежаць ад падрыхтоўкі да яе. І ў студэнтаў факультэта прыкладной матэматыкі гэтае пытанне ужо дауно стаіць на першым месцы.

На факультэце створана акадэмічная камісія, у якую увайшлі лепшыя студэнты: Наумовіч, Азарау, Кузуб, Дзівакова. Камісія кантралюе наведванне студэнтамі лекцый і правярае іх вучобу, раіцца з выкладчыкамі, як лепш студэнтам рыхтавацца да тых ці іншых заняткаў і калёквіумаў.

Асаблівая увага ўдзяляецца першаму курсу. І старшакурснікі Сычоў, Фядзеня, Калюжная наладжваюць кансультацыі, заўсёды дапамагаюць ў складаных пытаннях. Ды і самі першакурснікі старанна рыхтуюцца да залікаў.

Адчуваецца, што зімовую сесію студэнты факультэта прыкладной матэматыкі сустрэнуць у поўным узбраенні.

А. ЛАМЕКА.

НА КАФЕДРАХ І Ў ЛАБАРАТОРЫЯХ

УПЕРШЫНЮ Ў РЭСПУБЛІЦЫ

ЗВЫЧАЙНА набліжэнне Новага года прымушае аглянуцца назад, зрабіць аналіз пройдзенага шляху. Чым жа ён адзначан для калектыву кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта!

Нашы намаганні былі накіраваны перш за усё на паляпшэнне вучэбнай работы. Загадзя былі складзены, абмеркаваны і зацверджаны індывідуальныя планы выкладчыкаў, праграмы слецкурсаў, тэматыка дыпломных работ, тэматычныя планы лекцый і практычных заняткаў. Для студэнтаў завочнага факультэта распрацаваны метадычныя ўказанні і кантрольныя заданні па судовай статыстыцы. Перыядычна на пасяджэннях кафедры разглядаюцца пытанні методыкі, праводзяцца адкрытыя лекцыі і абмеркаванне іх.

Маладыя выкладчыкі атрымліваюць неабходную дапамогу у авалоданні методыкай выкладання. Практыкуецца наведванне і абмеркаванне іх лекцый, пауторнае рэцэнзіраванне кантрольных работ завочнікаў з падрабязным разборам.

Для таго, каб палепшыць работу старшых лабарантаў, была распрацавана падрабязная інструкцыя аб абавязках вучэбна - дапаможнага персаналу, якая атрымала адабрэнне.

Члены кафедры аказваюць пастаянную метадычную дапамогу студэнтам у правільным складанні канспектаў лекцый, напісанні курсавых работ і дакладаў для навуковых гурткоў, у падборы і сістэматызацыі матэрыялаў у час працы над дыпломнымі.

Па спецыяльнаму графіку праводзяцца кансультацыі для студэнтаў усіх форм навучання: для дзённага і вячэрняга —штотыднёва, для завочнікаў—адзін раз у месяц.

Прафесарска - выкладчыцкі састаў кафедры вядзе па сваіх прадметах улік наведвання лекцый і практычных заняткаў. Студэнты, якія прапускаюць лекцыі або прыходзяць на заняткі непадрыхтаванымі, выклікаюцца на абавязковыя кансультацыі для здачы залікаў па адпаведных тэмах.

У перадсесійны перыяд выкладчыкі праводзяць гутаркі са студэнтамі аб методыцы падрыхтоўкі да экзаменаў па асобных дысцыплінах. Па найбольш складаных тэмах арганізуюцца калёквіумы. У другой палове семестра даюцца заданні на паутарэнне пройдзенага матэрыялу з апытаннем на працягу 15—20 мінут на кожных практычных занятках. Самастойная праца студэнтаў актывізуецца і кантрольнымі пісьмовымі работамі па вывучаных раздзелах курса (дзін—два разы у семестр). Некаторыя кантрольныя работы праводзяцца па індывідуальных заданнях, распрацаваных для кожнага студэнта паасобку. Так, па асаблівай частцы крымінальнага права было падрыхтавана 35 індывідуальных заданняў, і студэнты перад кантрольнай цягнулі білеты з пытаннямі і задачамі, як на экзамене.

Вялікую увагу ўдзяляла кафедра распрацоўцы вучэбных дапаможнікаў, метадычных пісьмаў і указанняў.

Падрыхтаваны і здадзены у друк вучэбныя дапаможнікі «Крымінальнае права БССР. Агульная частка» і «Крымінальнае права БССР. Асаблівая частка». Яны напісаны у адпаведнасці з праграмай ВНУ, аднак прымяняльна да крымінальнага права Беларускай ССР. Аб'ём кожнага дапаможніка—30 друкаваных аркушаў. Выданне гэтых кніг (абедзве запланаваны на 1971 год) будзе садзейнічаць больш глыбокаму вывучэнню студэнтамі крымінальнага права рэспублікі. Кожны студэнт зможа набыць кнігі, у якіх знойдзе адказы па ўсіх пытаннях вучэбнай праграмы. Падобнае выданне будзе першым у рэспубліцы.

І. ЦІШКЕВІЧ,
загадчык кафедры крымінальнага права.

Здаўна славіцца руская зямля гасціннасцю. Гэта добрая традыцыя жыве і цяпер. Сотні маршрутаў па зямлі, у небе і па моры звязваюць нашу сталіцу з сяброўскімі краінамі. Прадстаўнікі розных народаў знаходзяць агульную мову, абмяркоўваючы праблемы навукі, эканомікі, мастацтва. Сябруе паміж сабой і моладзь розных нацыянальнасцей. Хлопцаў і дзяўчат з усіх частак свету можна сустрэць у вну нашай краіны.

Я раскажу вам аб адным — аб хлопцу з Лівана.

На усходнім узбярэжжы Міжземнага мора засталася радзіма студэнта III курса матэматычнага факультэта нашага універсітэта Жака Антуана Амідзі. Нібы у казцы: за марамі, за гарамі...

Часам пасля лекцый, калі Жак застаецца у пакоі адзін, ён любіць глядзець на захад сонца.

У Мінску вечар, а у далёкім Бейруце у гэты час абед. Ля стала збіраецца уся яго сям'я: бацька, маці, чатыры сястры і малодшы брацік Гары. У гэты момант яны, канешне, успамінаюць непаседлівага Жака. У яго было многа сяброў, і абедаць ён усіх вёў да сябе. І тады дом напаўняўся задорным гоманам...

А цяпер за сталом спакойна. Толькі пісьмы ды ўспаміны звязваюць іх з Жакам. Але памяць беражліва захоўвае дзяцінства...

Хлопец з Бейрута

Як толькі промні сонца пачыналі слізгаць па стрэхах дамоу, партовы горад ажываў, і вуліцы яго напаўняліся патокамі людзей.

— Жак! Жак!—раздаваліся за высокай агарожай галасы смуглявых хлопчыкаў з чорнымі, як смоль, чубамі. — Пайшлі на мора?!

Жак саскоквау з тапчана і прасоувау галаву праз вінаградную лазу, якая густа абвівала веранду невялікага асабняка.

— Ды цішэй вы, маці пачуе! — гаварыу Жак і на пальчыках спускауся па лесвіцы, прыхапіўшы з сабой яблыка і кусок перапечкі. Калі ён аказваўся за весніцамі, стрымаць яго ужо было немагчыма. Хлопчыкі беглі у порт.

Рабочая мітусня, гудкі вялізных акіянскіх параходаў, высокія краны — усё гэта неадольна вабіла хлопчыкаў. У порце яны праводзілі цэлыя дні.

Набегаўшыся, Жак прыходзіу дадому, атрымліваў наганяй ад маці, з апетытам еу і адпраўляуся спаць на веранду. Адтуль ён добра чуу, як маці працягвала абурацца, а бацька спакойна гаварыу:

— Вось пойдзе у школу, паразумнее.

Лета набліжалася да канца. Усё часцей з мора дулі халодныя імжыстыя вятры.

Прыйшла восень, першая, школьная для Жака.

Недалёка ад Дамаскай шашы, амаль у цэнтры горада, знаходзіцца рэлігійная школа ордэна Святога Сэрца. Жака прынялі у гэтую школу з умовай, калі за навучанне бацькі будуць плаціць 500 ліванскіх фунтау.

Школьнікі вучыліся па праграме дзяржаунага навучання і, акрамя таго, тры разы на тыдзень адпраўляліся на службу у касцёл.

Урокі, богаслужэнні, пакаранні за парушэнні правіл рэжыму змянялі адно другое.

Так прайшло трынаццаць год. Закончыўшы школу, Жак вырашыу працаваць. Хацелася быць самастойным, незалежным ні ад каго, не чуць частых папрокаў збяднелага бацькі.

Працаваць... Але дзе знайсці яе, работу?

Жак гаварыу, што яму пашанцавала. Многа хадзіць у пошуках не прыйшлося. Пісьменнага хлопца узяу на месца настаўніка уладальнік рэлігійнай школы ордэна Мехітарыстаў. Для гаспадара Жак быу знаходкай, бо спецыялісту ён павінен быу плаціць поуную суму заработку, а Жак атрымліваў палову, таму што быу непаўналетнім.

Спачатку ён выкладау французскую мову і гісторыю, а з цягам часу і хімію, і фізіку, і геаграфію. За гады працы многа змен адбылося у яго жыцці. Ён многа чытаў, уважліва сачыу за падзеямі у свеце.

Аднойчы у размове з сябрамі зайшла гутарка аб Савецкім Саюзе, аб Маскве.

— А ты, Жак, хочаш паехаць вучыцца у СССР? — нібы знарок, спытау адзін з таварышаў.

— Дык давай жа, збірай свае пажыткі, — з усмешкай дабавіу ён.

Жак спачатку не зразумеу, падумау: жартуе, разыгрывае. Паглядзеу у твар: сур'ёзны. А таварыш, пачаушы размову, працягваў:

— Спецыялісты Лівану вельмі патрэбны... Зайздрошчу табе, хлопец...

Праз чатыры дні Жака праводзілі усёй сям'ёй. Ён стаяў на палубе беласнежнага савецкага цеплахода «Арменія» і не мог паверыць, што гэта не сон. На прычале у шумлівым натоупе праводзячых Жак бачыу твары сяброў, сясцёр, якія махалі яму рукамі. Тут жа стаяла яго маці. Яна усміхалася, нешта старалася сказаць свайму сыну, але словы танулі у людскім шматгалоссі. А вочы яе бліснэлі слязьмі радасці: яе сын шчасліучык, адзін з пяцідзесяці маладых ліванцаў!

Калі цеплаход адчаліу ад берага і выйшаў з каўша порту, Жак убачыу Бейрут з мора. Вядомая сваёй старажытнасцю Дамаская шаша дзяліла горад на дзве часткі.

Злева — шматпавярховыя, сучаснай архітэктуры будынкі, рэстараны, бары з вялізнымі рэкламамі. Гэту частку горада у Бейруце называюць маскай. Справа ад Дамаскай шашы неба падпіраюць трубы тэкстыльных фабрык. Тут жа і пацямнеушае ад часу жыллё рабочых. Гэты раён Бейрута — твар горада...

Цеплаход хутка адыходзіу у мора. Бераг патануу у блакіце, толькі недзе на вышыні хмар бялелі горы.

Праз чатыры дні плавання Жак са сваімі землякамі сышоу на прыстань Адэскага порта.

Наступіла пара студэнцкага жыцця. Для Жака гэта не проста лекцыі і семінары, не. Гэта, у першую чаргу, знаёмства з краінай, якая дае веды, з яе цудоунымі людзьмі.

За прайшоўшыя гады вучобы ён пабываў у Маскве, Кіеве, Ленінградзе, Казані, і усюды у яго заставаліся сябры.

Раніцай, калі я знайшоў Жака, ён сядзеу за канспектамі: праз гадзіну у яго пачыналіся практычныя заняткі.

— Рабочыя камвольнага камбіната запрасілі на мітынг, прапусціу лекцыю, даводзіцца самому даганяць, — з усмешкай гаворыць Жак. — А убачыцца можам вечарам, пасля пасяджэння савета дружбы.

Дзіуна, як у яго хапае часу і на грамадскую работу, і на удзел у мастацкай самадзейнасці? Гэтага ж студэнта ведаюць і любяць і па канцэртных выступленнях.

Мы выйшлі з інтэрната. Пушысты снег ахутаў увесь універсітэцкі гарадок. Жак жмурыцца ад яго белізны:

Раньше снег он видел
лишь в кино,
А потрогал — очень
холодно... —

напявае Жак знаёмую песню.

— Усё, як у песні, —смяецца ён.

Мы развіваемся, развіваемся ненадоўга, бо вучымся у адным універсітэце.

М. ІНІН.

РАЙЦЦА САВЕТ ДРУЖБЫ

У інтэрнаце замежных студэнтаў, у невялікім пакоі, абсталяваным в'етнамскімі студэнтамі, сабраўся савет дружбы універсітэта. Старшыня яго, студэнт IV курса матфака Пётр Вакульчык, растлумачыу асноўныя пытанні, якія савет павінен абмеркаваць.

Пытанні гэтыя не былі загадкавымі для прысутных, бо кожны ведаў, што ідзе другі этап Ленінскага заліку, ведалі і тое, што набліжаецца сесія.

— У сучасны момант, — адзначыу П. Вакульчык, — інтэрнацыянальнаму выхаванню моладзі надаецца асаблівая ўвага. Таму ад савета дружбы патрабуецца пэуная дапамога. Да Ленінскага заліку добра было б правесці шэраг гутарак на такія тэмы, як «Мы жывём у краіне Вялікага Леніна» або «Жыццё маёй краіны». У нас на матфаку гэтыя гутаркі ўжо праводзяцца.

Пытанне паспяховасці закранула на нарадзе кожнага. Самір Шахін, студэнт юрфака, адзначыу, што вельмі непрыемна савету дружбы, калі ў замежнага студэнта ёсць запазычанасць.

— Хваробу непаспяховасці неабходна лячыць, як толькі яна пачынаецца. Варта ў такім выпадку, — гаворыць Самір,— пагутарыць з выкладчыкам, і калі той бачыць, што студэнту цяжка даецца, напрыклад, руская мова, трэба арганізаваць яму дапамогу.

Кожнае пытанне нарады горача абмяркоўвалася. Джон Флетчар, аспірант фізфака, унёс цікавую прапанову: у нейкай ступені аб'яднаць работу саветаў дружбы універсітэта і політэхнічнага інстытута.

Позна ўвечары разыходзіліся хлопцы і дзяўчаты. Добрыя ўражанні пакінула нарада у кожнага яе ўдзельніка.

В. РАДКЕВІЧ.

І ЗАДАВАЛЬНЕННЕ І ЎРОК

Беларускі дзяржаўны танцавальны ансамбль пад кіраўніцтвам заслужанага артыста УССР і заслужанага дзеяча мастацтваў БССР А. Г. Апанасенкі вядомы не толькі у рэспубліцы. Добрая памяць аб выступленнях беларускіх артыстаў засталася у гледачоў Галандыі, Чэхаславакіі, Сірыі, Венгрыі і іншых краін. Аб гэтым гавораць надпісы на сувенірах, памятных альбомах, падараваных калектыву.

А зусім нядаўна танцавальны ансамбль быў госцем універсітэта. Нашы студэнты і выкладчыкі змаглі самі пераканацца ў выключным майстэрстве гэтага нястомнага калектыву.

Віхурай уляцела ў залу знаёмая мелодыя «Лявоніхі», закружыла танцораў, прымусіла гледачоў забыцца аб клопатах надыходзячай сесіі. «Лявоніху» змяняе бойкая кадрыль. Блакітнымі, малінавымі, бірузовымі фарбамі расцвітае сцэна пад гукі вогненнага чардаша. А вось у зале гучыць пяшчотная мелодыя лірычнага танца «Залатая куклянічка». Здаецца, цёплы сонечны струмень пранікае на сцэну разам з танцуючымі ў залацістых сарафанах дзяўчатамі. Грацыёзнасць, пластыка, незвычайная зладжанасць рухаў, задушэўнасць у выкананні. А на сцэне ужо новы танец... Закружыліся ў зацярушаных снегам паўшубках юнакі і дзяўчаты, імчыцца «тройка», а за непаваротлівым мядзведзем бяжыць, крыўляючыся, чорт. Гэта «Мяцеліца» — тэмпераментны беларускі танец. Пасля — полька, гапак...

Кожны танец суправаджаецца працяглымі апладысментамі. Яны асабліва прыемны артыстам, таму што ў зале нямала сапраўдных знаўцаў танца, сярод якіх удзельнікі універсітэцкага танцавальнага ансамбля «Крыжачок», які таксама заваяваў нямала ўзнагарод.

Канцэрт заканчваецца. Артысты ўзнагароджваюцца універсітэцкай граматай і памятным сувенірам. Удзельнікі ансамбля «Крыжачок» падносяць ім кветкі.

Я звярнулася да А. Г. Апанасенкі з просьбай выказаць сваю думку аб нашым «Крыжачку».

— Танцавальны калектыў універсітэта, — сказаў ён,— я ведаю даўно: не раз быў членам журы пры правядзенні конкурсаў. Калектыў робіць вялікія поспехі. Удзельнікі добра валодаюць тэхнікай выканання. Аднак выступленні іх павінны быць больш масавымі. Можна ж сярод студэнтаў такой вялікай навучальнай установы адшукаць тых 60 чалавек і выхаваць з іх прафесіянальных майстроў танца.

Пакідаюць залу гледачы. Абменьваюцца ўражаннямі. Яны атрымалі ў гэты вечар не толькі эстэтычную асалоду, але і добры ўрок танцавальнага майстэрства.

Н. МАРАДУДЗІНА.
Фота Д. ЧАХОВІЧА.

Мароз—паважны, Як вялікоўна,
Знаёміць свавольніцтва не можа,
І на той час, як ён панує,
Па небе хмаркі не вандруе,
І ўсе стварэнні заміраюць,
І патыхаць ветры не смеюць.
Усё ціха, мёртва, нерухома.

(Я. Колас).

СКАРГА ПА ДЗЕДА МАРОЗА

НАВАГОДНІ ФЕЛЬЕТОН

НАДВЯЧОРКАМ я спяшаўся ва універсітэт на апошнюю у гэтым годзе лекцыю. Пакуль чакаў тралейбуса, ехаў, — зусім сцямнела. Каб паспець да званка, рашыў «зрэзаць» вугал. Хоць і цёмна, звярнуў у скверык і літаральна на другім кроку спатыкнуўся.

Што магло пад ногі трапіць? Чую, хтосьці кліча:

— Дапамажыц-е-е...

Голас як з-пад зямлі, глухі, ледзь чутны.

Аказваецца, чалавек у снезе ляжыць. Ужо увесь скарчанеў на марозе. Толькі зубамі чачотку выбівае.

— Вы п'яны? — схіляюся над ім.

— Н-н-не, — адказвае, — дацэнт я... Абібочкін. Д-д-дапамажыце...

Мо захварэў, думаю сабе. Узваліў на плечы і прыцягнуў у фае галоўнага корпуса. Тут толькі разгледзеў: твар знаёмы, але асабіста Абібочкіна я не ведаю. Ды і прызнаць яго было цяжка — увесь пасінеў ад холаду, а нос і вушы пабялелі. Я ўзяўся жвава цёрці яму пальцы, твар.

— Я... я... я скардзіцца буду, — усё больш і больш прыходзіў ён да прытомнасці. — У мясцком пайду! Мо, туды напішу...

— Не трэба хвалявацца, — супакойваю яго. — Хто вас пакрыўдзіў? Студэнты?

— Студэнты?! — ажывіўся Абібочкін.—Дзед Мароз! Вось хто! Я гэта так не пакіну!

Тут прыйшла чарга мне здзівіцца:

— Вы штосьці блытаеце. Як мог гэты паважаны стары пакрыўдзіць дацэнта? Не паверу.

— Не паверыце?! — стаў наступаць на мяне Абібочкін. — Ён мяне з трэцяга паверха скінуў. Мог забіць або скалечыць. Вось паслухайце.

Прыходжу гэта я сёння на навагодні факультэцкі вечар. Ёлка зіхаціць рознакаляровымі агнямі, урачыстасць разліта, калі можна так сказаць, па усяму паверху. Навокал смех, песні. Пакуль дэкан прывітальную прамову гаварыў, я збегаў у буфет. Калі вярнуўся, ужо пачаліся танцы. Тыя пару кілішкаў каньяку у буфеце мне дадалі смеласці. Ды ці можна было уседзець на месцы? Такія лялькі навокал! Адна апранулася пад сняжынку, другая пад Бабету... Былі тут «пікавыя» дамы, венеры, лісічкі... і большасць — ужо не па модзе, у кароткіх сукенках, а некаторыя у звышкароткіх. Мабыць, дзейнічалі па прынцыпу — «бывай, мода!».

Карацей кажучы, я пайшоў танцаваць з адной з такіх лялек. І адзін круг не абышоў, як хтосьці палажыў руку на плячо. Гляджу — Дзед Мароз, асабістай пярсонай. Ён так цёпла паглядзеў мне ў вочы і сказаў:

— Беражыце сябе, дацэнт. Свята святам, а вы хворы чалавек. Лепш пасядзіце, паглядзіце на іншых.

І ужо па-старэчаму дадаў:

— Ня трэ, ня трэ...

Што ты будзеш рабіць са старым? Я яшчэ некалькі разоў парываўся, ды стары тут як тут: «Ня трэ» — і усё.

Я ўжо крыху нават супакоіўся, але калі зайгралі беларускую польку, не ўседзеў. Толькі кінуўся у скокі, як Дзед Мароз схапіў мяне за каўнер, расчыніў акно і шугануў у снег. Да вушэй данесліся словы старога: «Ён жа хворы, яму нельга танцаваць!» Ды з такой злосцю ён крыкнуў, якой я ніколі не адчуваў нават ад цёшчы, дзесяць год жывучы разам.

Больш нічога не памятаю. Тут вы мяне і знайшлі.

Я зноў здзівіўся:

— Значыцца, вы хворы? Стары правільна папярэджваў.

— Хворы? У тым жа і справа, што Дзед ведае, які я хворы. Інакш не зрабіў бы такое злачынства.

— Нічога не разумею, — перабіў я Абібочкіна.

— А вам і разумець не трэба. Зрэшты, вы мне падабаецеся. Так і быць, раскажу.

Справа у тым, што хворым быць выгадна. Ой, як выгадна! — Абібочкін выцер ужо расчырванеўшую лысіну і працягваў:—Неяк мяне звалю грып. Раптам. За некалькі гадзін да лекцыі, нават не змог пазваніць, каб замянілі. Ляжу дзень, два. На трэці ўвальваецца у кватэру цэлы натоўп, амаль уся кафедра прыйшла. Ну, як прынята у такіх выпадках, усе спачуваюць, нават тыя, хто раней лічыў мяне гультаём. А нанеслі усяго столькі, што на цэлую сям'ю на тыдзень хапіла б.

Праз які час я выйшаў на работу. І што б ні рабіў — ці чытаю лекцыю, ці рыхтуюся у бібліятэцы,—не магу пазбавіцца ад думкі, як добра і цёпла мне было хворам.

Неяк пазваў мяне загадчык кафедры і кажа:

— Званілі з таварыства «Веды». Просяць даць дакладчыка для паездкі у Барысаў. Надвор'е дрэннае, вось мы і рашылі паслаць вас як больш мацнейшага здароўем.

І тут мяне асяніла:

— Што вы! — кажу прафесару, — я ледзь хаджу. Яшчэ з тых дзён не магу у сябе прыйсці. Доктар сказаў, што можа быць ускладненне. А я адчуваю, што яно ўжо ёсць.

Прафесар — чалавек добры, знайшоў замену. Але я, каб не падарваць давер'я, вымушан быў зноў з тыдзень «хварэць». І ведаеце, зноў з кафедры прыйшлі. На гэты раз прынеслі усяго яшчэ больш. Ды што там больш... У адным з пакецікаў была чакушачка, у другім бутэлька віна.

З таго часу я і пачаў хварэць. Як толькі пачую, што збіраюцца кудысьці паслаць ці даць мясцовае даручэнне,— у ложак. Скажуць рыхтавацца да справаздачы аб навуковай рабоце, я захварэю. Хворых не б'юць, а біць трэба было б — я ж нічога не раблю. Успамінаю, як аднойчы на кафедры абмяркоўвалі пытанне аб навуковых даследаваннях. Загадчык усім усыпаў, мяне не чапаў. Але тут хтосьці выкінуў:

— А Абібочкін вызвален ад гэтых абавязкаў, ці што?

У прафесара маланкай загарэліся вочы:

— Вы бесчалавечны чалавек! Як вам не сорамна? Ці можна з хворага патрабаваць?! Гэта не гуманна. Нехай ён рыхтуе лекцыі і глядзіць сябе. Усё для чалавека, для дабрабыту чалавека — гэта не толькі словы, гэта наша паусядзённае жыццё, наша мараль...

Прыгожа гаварыў прафесар тады, аж у мяне слязу выціснуў.

Хутка ва ўсім універсітэце ведалі, што я захварэў. Ніякіх даручэнняў! Раскоша! Я нават з пасяджэнняў кафедры, калі яны зацягвалісь, адпрашваўся. Не магу, кажу, доўга сядзець.

Цяпер, акрамя лекцый, нічога не ведаю. А мне усе спачуваюць.

Бывае, сустрэнешся са знаёмым і чуеш:

— Ну што, хварэем?

— Так, баліць.

— У грудзях?

— У грудзях.

— Мо' жаба?

— Ды не. Тут, — паказваю на грудзі, — звер больш страшны. Ён можа і узад і уперад рухацца. — Намякаю на рак.

Цёплы поціск рукі, а часцей за усё прапанова: можа чым дапамагчы?

Карыстаюся такімі прапановамі, карыстаюся. Вось ужо пяты год запар езджу бясплатна на курорты па мясцкомаўскіх пуцёўках.

Так загарыш на сонцы за лета, так умацуеш свае сілы, што, здаецца, каб можна было, вось гэту калону звярнуў бы ў бок і зацягнуў бы у скверык, каб студэнтам дзе было сядзець вечарамі.

— Ах ты, паразіт, — кажу, — цябе не толькі з трэцяга паверха...

— Не, не паразіт, — спужаўся мой субяседнік. — Абібочкін маё прозвішча. Я ж гаварыў. Ведаеце, лёгка запомніць: А-бі-бочкін, бі у бочку, абы грымцела. Хе-хе-хе...

Гэтае «хе» канчаткова вывела мяне з сябе. Зауважыўшы мае сціснутыя кулакі, Абібочкін стаў адступаць задам да дзвярэй, але раптам затрымаўся і з нейкай фанабэрыстасцю дадаў:

— А думаеце, я адзін такі ва універсітэце? Нас, абібочкіных, хапае. У нас розныя хваробы і па-рознаму яны называюцца — хронікус балбатунас, хітрыкус, прайдзісветус і іншыя, але вылечыць іх цяжка. Навокал жа вельмі працавітыя і гуманныя людзі. Вельмі!

Ён горда падняў галаву і пакрочыў да выхаду.

М. РЭГІСТАНАЎ.

ПЕЦЯ ЦЮРЫКАЎ І ІНШЫЯ

У гэтыя заліковыя дні студэнт немагчымае робіць магчымым: у дзве ночы пазнае праграму семестра, у сотні разоў паскарае працэс чытання. Гэта, вядома, прагрэс, але цяжкаваты.

А вось студэнт фізічнага факультэта Пеця Цюрыкаў, упершыню сутыкнуўшыся з сесіяй, вырашыў выпрабаваць свой, асабісты метад, а пасля і запатэнтаваць яго можна.

У адзін з апошніх дзён старога года Пеця заглянуў у чытальную залу і запісаў на свой 3549-ы нумар падручнік аутара Кортнева «Практикум по физике».

«Ну, — думае Пеця, —цяпер ашаламлю ведамі—ахнуць». Дзень, праведзены адзін-на-адзін з падручнікам, напамінаў сімфонію працы, але нераскрытых пытанняў за ставаўся непачаты край. Вось тут Пеця Цюрыкаў і ўсклікнуў:

— Эўрыка!!

Выскачыў з чытальнай залы і праладкаваўся да ручайка здаючых літаратуру, а калі падышла яго чарга, спакойна назваў свой нумар, але... у адваротным парадку. Такога нумара не анаталася, але Пеця Цюрыкаў прадугледзеў.

— Значыць, білет чытача за вамі... а «Практыкум» за мной, — пачаў быў Пеця дыктаваць свае умовы, але... правілы чытальнай залы гэтага не дазваляюць.

Пеця не разгубіўся і вырашыў правесці псіхалагічную апрацоўку. Канстатую факт, што слоў Цюрыкаў сказаў вельмі многа і з рознай эмацыянальнай афарбоўкай, але гэта таксама не дапамагло. Паугадзіны ён затрымлівау чаргу, даказваючы сваю правату, але беспаспяхова.

А раніцай наступнага пераднавагодняга дня Пеця «ўспомніў» парадак лічбаў свайго білета і заспакоены з'явіўся перад супрацоўнікамі чытальнай залы. Так як прасіць прабачэння не ўваходзіць у Пеціи новы метад, ён нават не паспрабаваў сваю віну загладзіць,

А студэнткі Ларысы, з матэматычнага факультэта Турко і з гістарычнага Сітнік, не вызначаюцца арыгінальнасцю. У чытальнай зале яны ўзялі кнігі некалькі год назад. Кожны навагодні вечар дзяўчаты дастаюць гэтыя выданні з патайных ларчыкаў і беражна сціраюць пыл, прыгаворваючы: яшчэ гадок пратрымаліся, не рассталіся.

А можа пара паднесці бібліятэцы навагодні падарунак і развітацца з чужым скарбам?

Р. ВАШУК.

Вясёлыя дыялогі

— Не забудзьце указаць першакрыніцы.

— Каб вы толькі ведалі, якія цяжкія пытанні мне задавалі! — гаварыў аспірант пасля абароны дысертацыі.

— І ты на усе адказаў?

— За выключэннем аднаго: якое практычнае значэнне маей дысертацыі.

●

— Ці не скажаце, прафесар, куды я траплю, калі, напрыклад, з гэтай залы прасвідрую дзірку праз увесь дыяметр зямлі?—запытаў аднойчы на лекцыі нейкі студэнт вядомага нямецкага геолага Рэмера.

— У псіхіятрычную бальніцу.

●

— Кажуць, што розум дае маці, а не інстытут.

— Бедалага! Вы, мабыць, выраслі сіратою.

●

— Гэта ужо трэцяе пытанне, на якое вы не можаце адказаць.

— Калі ласка, дайце мне час падумаць.

— З задавальненнем. Даю вам цэлы год.

— Яшчэ адзін анекдот, прафесар...

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон—22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Тыраж 2000 экз. Зак. 1654. АТ 09594.